*Л.М.УЛАДЫКОЎСКАЯ*

# КУЛЬТУРНАЯ САМАБЫТНАСЦЬ ЯК ДУХОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ СУЧАСНАСЦІ

*Сёння ў глабальным свеце культурная самабытнасць выступае ў якасці духоўнай каштоўнасці: яна забяспечвае захаванне і развіццё нацый і нацыянальных культур, з'яўляецца асновай нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, рэалізуе і дэманструе духоўны і творчы патэнцыял народа. Разгляду гэтай каштоўнасці і прысвечаны артыкул.*

У наш час пытанне захавання і развіцця арыгінальных нацыянальных культур – адно з самых абмяркоўваемых. Прычынай гэтаму выступаюць глабальныя тэндэнцыі да уніфікацыі, стандартызацыі, інтэнсіўныя працэсы змяшэння культур і ўзнікненне вядомага феномена культурнай мазаічнасці.

Многія даследчыкі, у тым ліку з краін СНД, успрымаюць глабалізацыю як экспансію каштоўнасцей асобных дзяржаў і лічаць, што імкненне да дамінавання гэтых дзяржаў неаддзельнае ад іх пераваг у інавацыйна-тэхналагічнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах. Але варта памятаць, што глабалізацыя – гэта ў пэўным сэнсе канкурэнцыя і спаборніцтва, што наводзіць на думку пра якасць тавараў і паслуг, культуратворчага працэсу ў цэлым, які дэманструе свае моцныя якасці ў глабальным універсуме аналагічных з'яў. Культурная арыгінальнасць сёння выступае асноўнай умоваю гэтай канкурэнтаздольнасці.

Культурная самабытнасць, з'яўляецца асновай культур і нацый, спрыяе іх захаванню і развіццю, чым забяспечвае паўнапраўны міжкультурны дыялог, само права на культурныя адрозненні, што набывае якасць каштоўнасці глабалізму. Культурная самабытнасць служыць падмуркам нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, роля якой узрастае ў сучасным глабальным свеце. Яна па-ранейшаму выяўляе сілу, арыгінальнасць, непаўторнасць, творчы патэнцыял, спецыфіку той ці іншай грамадскай супольнасці (часцей за ўсё – нацыі), характарызуе нацыянальна-культурнае ядро. Праз культурную самабытнасць захоўваюцца і развіваюцца духоўна-маральны пачатак грамадскай супольнасці, уся сфера духоўнага быцця.

У еўрапейскім рэгіёне праблема суадносін нацыянальнага і універсальнага аспектаў грамадскага быцця і культуры існавала ад самых вытокаў хрысціянскай цывілізацыі. Толькі ў XVIII–XIX стст., калі фарміраваліся сучасныя еўрапейскія дзяржавы, паўсталі шматлікія канцэпцыі (этналагічныя, філасофскія, сацыякультурныя, сацыялінгвістычныя) нацыянальнага і універсальнага. На думку У.Конана, гэтыя канцэпцыі канчаткова аформіліся, падзяліўшыся на тры асноўныя тэорыі-гіпотэзы – субстанцыяльную, функцыянальную, квазісубстанцыяльную [2].

Успрыманне кожнай нацыі па аналогіі з чалавечай асобаю, якой уласцівы аналагічныя правы, плённа развівалася ў межах персаналістычнай канцэпцыі нацыі, што мае вялікае значэнне для разумення праблемы культурнай самабытнасці. Гэтая канцэпцыя развівалася пераважна ў межах польскай хрысціянскай плыні (працы Яна Паўла ІІ, Чэслава Бартніка і інш.), яна слаба даследавана і мала прадстаўлена ў беларускай гуманітарнай навуцы, таму патрабуе пільнай увагі.

Згодна з персаналізмам нацыю трэба разумець як натуральную чалавечую агульнасць, якая стварае вялікі калектыўны арганізм у плане біялагічным, экзістэнцыяльным, культурным, сацыяльным і агульнай самасвядомасці, жыве ў мацярынскім часе-прасторы свету і не з'яўляецца вынікам ідэалогіі, права ці думкі. Гэтая людская супольнасць мае характар анталагічны і рэальны.

Па аналогіі з асобай нацыя мае вымярэнне цялеснае, духоўнае і асобаснае. Вымярэнне цялеснае ўключае ў сябе генезіс, супольную гісторыю, традыцыю, супольны лёс, супольнае існаванне, айчыну як нішу жыцця, тэрыторыю, супольную гаспадарку і матэрыяльную культуру. Вымярэнне псіхічна-духоўнае падразумявае калектыўную суб'ектыўнасць, самасвядомасць, адчуванне акрэсленай этнічнай цэласнасці, разуменне сябе, духоўную культуру, мову, вышэйшыя каштоўнасці, сумесную нацыянальную практыку і нацыянальнае самавыхаванне [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыхільнікі персаналістычнай канцэпцыі нацыі лічаць апошнюю створанай Богам. Праціўнікі такой канцэпцыі бачаць у гэтым рэлігійную фікцыю і сцвярджаюць, што рэальна існуюць толькі супольнасці, створаныя самім чалавекам, ідэалогіяй, “сацыяльнай інжынерыяй”. Нацыі ў нашым разуменні звязаны этычным кодэксам, вышэйшымі каштоўнасцямі, абавязкам агульнага дабра. Мы бачым унутраную каштоўнасць нацыі (яе каштоўнасць самой па сабе). Праціўнікі тэалагічнага падыходу не бачаць у нацыі духоўнай, культурнай каштоўнасці, якая вызначаецца самабытнасцю, а здатныя разгледзець усяго толькі “сацыяльныя элементы”, грамадскія рухі, палітычныя сілы. З пункту гледжання прыхільнікаў персаналістычнай канцэпцыі, нацыя мае сваю глебу, сумленне, сямейную атмасферу, салідарнасць, ахвярнасць. Нацыя не служыць ніводнай партыі, ладу, ідэалогіі, але ўсе яны служаць народу. Сучасная палітычная, інтэлектуальная эліта не чуецца нацыянальнаю асобаю, будуе сваю дзейнасць на інтарэсе, бізнесе, барацьбе. Як вынік, услед за нацыяй адкідваюцца і такія каштоўнасці, як сама айчына, традыцыя, родная мова. Замест нацыі ўзнікае “грамадзянская супольнасць” як феномен рухомы, матэрыяльны, безасабовы, які паддаецца кіраванню сродкамі масавай інфармацыі, грашыма, таварам, тэхнікай.

Гістарычна нацыянальнае станаўленне ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы адбывалася ў шчыльнай сувязі ідэі нацыянальнага абуджэння з працэсамі дэмакратызацыі і лібералізацыі. Палітычныя тэндэнцыі ў розных краінах Еўропы на працягу апошніх пятнаццаці гадоў дэманструюць, што ідэалагічны саюз паміж нацыяналізмам і ліберальнай дэмакратыяй ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе быў часовым і няўстойлівым, а значэнне, у якім “нацыя” і “нацыяналізм” з’яўляюцца бясспрэчнымі саюзнікамі дэмакратызацыі, становіцца ўсё больш і больш аддаленым ад міжнароднага кантэксту ўспрымання сучаснага нацыяналістычнага дыскурсу. Разам з тым Беларусі крайне неабходна прайсці (хай сабе і паскораным чынам, у новых, сучасных глабальных умовах) усе этапы нацыянальнага станаўлення і культурнага развіцця (у тым ліку праз умацаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці), каб цалкам забяспечыць і замацаваць сваё існаванне ў якасці суб’екта гістарычнага развіцця і міжнароднай палітыкі.

Апрача таго, перавага каштоўнасцей калектыўных у процівагу каштоўнасцям асобы з’яўляецца пытаннем досыць спрэчным, бо катэгорыя нацыі як духоўна-маральнай і культурна-творчай адзінкі якраз і мае на ўвазе стварэнне ўмоў для найбольш поўнага і гарманічнага развіцця ў натуральным культурна-моўным кантэксце кожнага асобнага чалавека [4]. Нацыя рэалізуецца і ў маральнай плоскасці. Маральнасць нацыі акрэслівае яе быт і жыццё ў самой істоце, паступова ўзнікае поле самавыхавання, асветніцтва. Нацыя ставіць сабе мэты, выбірае каштоўнасці, да якіх звяртаецца сама і на якія арыентуе наступныя пакаленні, бо яна мае свае святыні, ідэалы і абавязкі.

Згодна са знакамітым сацыяльным філосафам Густавам Ле Бонам (1841–1931), нацыя ёсць найвышэйшая стадыя калектыўнага жыцця, за ёй ідуць формы дэгенерацыйныя, ніжэйшыя: натоўп, выпадковая супольнасць, спатканне адзінак. Нацыя ж тады становіцца нацыяй, калі створыць пэўны ідэал, які мае трывалую еднасць мыслення і адчування.

Антыглабалісцкі рух – толькі адна з выяў тэндэнцыі супрацьстаяння аднамернасці, аднаполюснасці свету. Імкненне да рэгіяналізацыі, узмацнення нацыянальнага сепаратызму, што ў розных кропках планеты часам набывае розныя выявы, з’яўляецца формай пратэсту супраць нівеліравання культурнай самабытнасці і права нацый уладкоўваць сваё жыццё максімальна самастойна. Культурная самабытнасць адлюстроўвае тую адметнасць нацыі, якая дазваляе ёй аптымальным чынам уладкаваць сваё жыццёвае асяроддзе і найбольш поўна і творча пазнаць і пераўтварыць навакольны свет, а таксама выявіць сябе ў ім.

Культурная самабытнасць – гэта назапашаная гістарычна-творчым досведам народа цэласная, гарманічная сістэма пэўных пазітыўных ведаў і вобразаў, дзякуючы якім пазнаецца (і пераўтвараецца) свет. Культурная самабытнасць, выяўляючы сілу народнага патэнцыялу ў сацыяльна-творчай сферы, стварае магчымасць для гістарычна-культурнага разгортвання ўсёй панарамы нацыянальнага быцця, забяспечваючы фактычна не толькі сацыяльна-культурны прагрэс, але і само існаванне народа. Чым складанейшыя задачы будуць паўставаць на шляху чалавека і народа ў будучыню, тым больш асэнсаванай і магутнай падтрымкі яны будуць шукаць у мінулым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каштоўнасць азначае не самі па сабе прадметы ці з'явы культуры, сацыяльныя працэсы, а іх грамадскую якасць і значэнне ў жыццядзейнасці грамадства. Каштоўнасць заўсёды прадугледжвае наяўнасць суб'екта ацэнкі – чалавека. У шырокім сэнсе каштоўнасці, як піша Р.Г.Апрасян, ёсць абагуленыя, устойлівыя ўяўленні пра што-небудзь як пра тое, чаму аддаецца перавага, пра дабро, гэта значыць пра тое, што адпавядае нейкім патрэбам, інтарэсам, намерам, мэтам, планам чалавека (або групы людзей, грамадства) [5].

Каштоўнасць культурнай самабытнасці належыць да каштоўнасцей духоўных, раскрываецца і праз каштоўнасці паўнаты жыцця, культуры, самарэалізацыі і нават праз цяпло, любоў, бяспеку, патрэбы ў чым забяспечваюцца камфортным сацыякультурным асяроддзем.

Духоўнасць, безумоўна, мае універсальны характар, але выяўляе сябе ў сацыякультурным быцці праз пэўную сістэму каштоўнасцей. У межах еўрапейскай цывілізацыі духоўныя каштоўнасці носяць, як вядома, хрысціянскі характар. Калі прыклад святой Маці Тэрэзы – хрысціянкі, якая самаахвярна служыла па ўсім свеце, пацвярджае тэзу аб універсальнасці хрысціянскіх духоўных каштоўнасцей, то жыццё і падзвіжніцкая дзейнасць ксяндза Адама Станкевіча – іх культурна-нацыянальны характар.

Сярод ідэалаў і каштоўнасцей, якія складаюць фундамент сучаснай духоўнасці і нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа, сфармуляваных яшчэ ў XVI ст., адзінства універсальнага і нацыянальнага, рэнесансна-гуманістычная канцэпцыя чалавека, прасякнутая ідэямі духоўнай свабоды, верхавенства закону, культурна-рэлігійнай згоды, этычнай дамінанты, непрыняцця гвалту і прымусу, развіццё культуры на нацыянальнай, беларускай моўнай аснове з'яўляюцца дамінуючымі і выступаюць асновай беларускай ідэнтычнасці.

Беларуская культурная самабытнасць каштоўная ў трох вымярэннях часу – мінуўшчыне, сучаснасці і будучыні. Для кожнага пакалення людзей яна актуальная, патрэбная, асабліва цяпер, у пачатку XXI ст., калі беларусы перажываюць складаны этап сваёй гісторыі. Культурная самабытнасць і нацыянальна-культурная ідэнтычнасць – гэта тая ментальная ўстойлівасць нацыі, якая ў глабальнай перспектыве можа забяспечыць няспыннае ўзнаўленне пакаленняў творчых, таленавітых, духоўна багатых людзей.

Беларусам варта змагацца з комплексам непаўнавартасці, узніклым у выніку адчування сябе "меншым суседам" з пункту гледжання суаднесенасці з вялікімі культурамі сумежных народаў. "Размытая", недааформленая нацыянальная самасвядомасць з'яўляецца адной з аб'ектыўных перашкод у развіцці арыгінальнай беларускай культуры.

Менавіта захаванне самабытнай беларускай культуры, арыгінальнай, непаўторнай, багатай на таленты – адзіная сапраўдная магчымасць для культурнай самаідэнтыфікацыі беларусаў. Адсутнасць традыцый незалежных грамадзянскіх ініцыятыў, натуральных для грамадства заходняга тыпу, карэлюе з тым, што большасць беларусаў жыве ў звыклай залежнасці ад дзяржавы: па-ранейшаму моцная псіхалагічная інерцыя савецкай сістэмы, у якой галоўнай каштоўнасцю аб'яўляўся калектывізм. Масавая свядомасць інертная і шаблонная, яна застаецца глыбока правінцыяльнай і патрыярхальнай. Для яе характэрна насцярожана-адчужанае стаўленне да нязвыклых культурных акцый.

Некаторыя даследчыкі параўноўваюць беларускую ідэнтычнасць з "маўклівай рэальнасцю", якая не здолела прабіцца на ўзровень рэпрэзентацыі з розных прычын: метафізічнай слабасці, містычнага нежадання, прыналежнасці да заганнага цывілізацыйнага кола [9]. Мадэрную фазу беларускай ідэнтычнасці Ігар Бабкоў, напрыклад, выводзіць з канца XVIII ст. (размова ідзе пра ідэнтычнасць шляхты) і лічыць, што яна да гэтага часу з яе не выйшла. Гэтая затрымка апісваецца звычайна як недааформленасць у выніку "перыферыйнага" ў адносінах да еўрапейскай "універсальнасці" статусу.

Сучасная структура культурнай прасторы вызначаецца тым, што беларуская мова працягвае функцыянаваць на вёсцы і ў сферы высокай культуры, руская – у адміністрацыі і грамадскім штодзённым ужытку. Першая рэпрэзентуе "этнаграфічную асаблівасць і мясцовы каларыт", другая мае характар метакультуры і захавання універсальных каштоўнасцей. "Постсавецкая ідэнтычнасць" хутка афармляецца ў "новую беларускую", аднак беларуская ідэнтычнасць, якая ад пачатку XX ст. не была аднароднаю, застаецца падзеленай: частка насельніцтва была дастаткова глыбока інтэграваная ў сімвалічную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэму саветызму, другая захоўвала повязь з нацыянальнай (лакальнай) традыцыяй. Наяўнасць падзелу ў ідэнтычнасці сучаснай Беларусі дастаткова відавочная, і сённяшнія рэаліі не спрыяюць інтэграцыі яе частак [10].

Захаванне культурнай самабытнасці з’яўляецца актуальнай задачай сучаснасці і ў беларускай сітуацыі патрабуе дзяржаўнай падтрымкі беларускай мовы, беларускіх культурных традыцый, уключаючы ўсе формы развіцця культурнай спадчыны, умацавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускага народа. Без стварэння натуральнага культурна-моўнага кантэксту і без глыбіннага духоўнага пласта народнага патэнцыялу на фоне глабальнага сацыякультурнага ўзаемадзеяння беларуская нацыя трапляе ў стан абсалютнай неканкурэнтаздольнасці і ніякі плённы міжкультурны дыялог для яе становіцца немагчымым. Сёння таксама небяспечным выступае і ўсялякае штучнае абмежаванне ў сферы сацыякультурнага абмену, міжкультурных камунікацый і да т.п., бо пагражае звесці беларускі народ да ўзроўню адсталага, правінцыяльна-местачковага, дапатопнага, выміраючага этнасу. Таму самае эфектыўнае рашэнне прадугледжвае гарманічнае ўзаемадапаўненне стабільнага нацыянальнага ядра ў выглядзе беларускай мовы і беларускай культуры і актыўнага міжкультурнага дыялогу, развіццё беларускай гуманітарнай навукі і філасофіі ў кантэксце еўрапейскіх здабыткаў і сусветнага вопыту, адкрытасць да засваення лепшага, павагу да іншых культур, валоданне замежнымі мовамі і інш.

Традыцыйна беларусы – годны, мужны, адукаваны народ, з пачуццём гонару за тысячагадовую культурную гісторыю, адкрытыя свету і гатовыя цалкам адкрыць сучасны і будучы свет для сябе.

---


1. *Лазаревич, А.А.* Глобальное коммуникационное общество / А.А.Лазаревич. – Мн.: Бел. наука, 2008. – 350 с.
2. *Конан, У.* Гармонія нацыянальнага і універсальнага ў быцці і культуры / У.Конан // Мастацтва. – 1995. – №6. – С. 2–4.
3. *Бартнік, Ч.С.* Тэалогія нацыі / Ч.С.Бартнік. – Чэнстахова, 1999.
4. *Уладыкоўская-Канаплянік, Л.* Акварэлі любові. Канцэпцыя нацыянальнага светапогляду ў творчасці Янкі Лучыны / Л.Уладыкоўская-Канаплянік. – Мн.: Энцыклапедыкс, 2000. – 126 с.
5. *Апресян, Р.Г.* Ценности / Р.Г.Апресян // Ценности гражданского общества и личность; сост. А.И.Михайлова; отв. ред. Р.Г.Апресян. – М.: Музей и общественный центр имени Андрея Сахарова, 2001. – 230 с.
6. *Краус, Вольфанг.* Нигилизм сегодня, или долготерпение истории. Следы рая. Об идеалах: эссе / Вольфанг Краус. – М.: Радуга, 1994. – 256 с.
7. *Мать* Тереза / авт.-сост. Н.В.Белов. – Мн.: Современный литератор, 1998. – 240 с. (Сер. “Жизнь знаменитых людей”).
8. *Конан, У.* Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі / У.Конан. – Мн.: Про Хрысто, 2003. – 128 с. – 16 с. іл. – (Бібліятэка часопіса “Наша вера”).
9. *Казакевіч, В.* Да праблемы генезісу беларускай ідэнтычнасці // В.Казакевіч, А.Казакевіч // Палітычная сфера. – 2006. – № 6. – С. 19–26.
10. *Бабкоў І.* Генэалёгія беларускай ідэі / І.Бабкоў // Arche: Пачатак. – 2005. – № 3. – С. 136–165.



*L.ULADYKOUSKAJA*


## CULTURAL ORIGINALITY AS A SPIRITUAL VALUE OF MODERNITY


The article is devoted to the problem of cultural originality preservation under the conditions of globalization. The author argues the idea that cultural originality is a basis of the national identity, cultural and social development; it realizes and shows spiritual and creative potential of the Belarusian nation in the past and in the future.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ